**Утойванне няшчаснага выпадку на вытворчасці**

Згодна з п. 8 Правілаў расследавання і ўліку няшчасных выпадкаў на вытворчасці і прафесійных захворванняў, зацверджаных пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь 15.01.2004 № 30 (далей – Правілы), службовая асоба страхавальніка неадкладна паведамляе кіраўніку страхавальніка (асобе, якая выконвае яго абавязкі) пра здарэнне няшчаснага выпадку. Парушэнне дадзенага і іншых патрабаванняў Правілаў расследавання і ўліку няшчасных выпадкаў на вытворчасці цягне адміністрацыйную адказнасць у выглядзе штрафу ў памеры ад 10 да 50 базавых велічынь (арт. 9.20 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адміністрацыйных правапарушэннях).

Разам з тым, не гледзячы на адміністрацыйную адказнасць, выпадкі парушэння службовымі асобамі Правілаў расследавання няшчасных выпадку на вытворчасці, у тым ліку ўтойванне няшчасных выпадкаў, маюць месца.

Так, у чэрвені 2018 г. з работнікам адной з арганізацый Смаргонскага раёна Гродзенскай вобласці адбыўся няшчасны выпадак на вытворчасці. Пацярпелы, разумеючы, што яго прычынай стала парушэнне ім патрабаванняў бяспекі, якім ён быў навучаны, папрасіў кіраўніка адасобленага структурнага падраздзялення не паведамляць дырэктару арганізацыі аб дадзеным факце. У снежні 2018 г. пацярпеламу ў сувязі з наяўнай траўмай медыка-рэабілітацыйнай экспертнай камісіяй была ўстаноўлена 3 група інваліднасці. У сакавіку 2019 г. ад работніка, які атрымаў траўму, кіраўніку арганізацыі паступіла пісьмовая заява аб расследаванні таго, што адбылося з ім у 2018 г няшчаснага выпадку. Згодна з заключэннем аб цяжкасці вытворчай траўмы, выдадзеным арганізацыяй аховы здароўя, траўма была аднесеная да катэгорыі цяжкіх, у сувязі з чым Смаргонскім міжраённым аддзелам Гродзенскага абласнога ўпраўлення Дэпартамента дзяржаўнай інспекцыі працы па факце траўміравання было праведзена спецыяльнае расследаванне няшчаснага выпадку, падчас якога ўстаноўлена, што адзінай прычынай няшчаснага выпадку стала парушэнне патрабаванняў па ахове працы самім пацярпелым (устаноўлена грубая неасцярожнасць).

Кіраўнік адасобленага структурнага падраздзялення, які не паведаміў кіраўніку арганізацыі пра здарэнне няшчаснага выпадку, прыцягнуты да адміністрацыйнай адказнасці ў выглядзе штрафу.

На падставе выкладзенага ў мэтах прафілактыкі парушэння правілаў расследавання няшчасных выпадкаў на вытворчасці прапануем службовым асобам арганізацый прааналізаваць дадзеную інфармацыю і прыняць дзейсныя меры па недапушчэнні падобных парушэнняў.

**Святлана Шатохіна,**
**начальнік Смаргонскага міжраённага аддзела Гродзенскага абласнога ўпраўлення Дэпартамента дзяржаўнай інспекцыі працы**